# ЗАХАВАННЕ КАШТОЎНАСЦЕЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ЯК ВАЖНЫ НАПРАМАК ПРАЦЫ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

Нацыянальная культура беларусаў натхняе айчынных мастакоў, паэтаў, пісьменнікаў, кампазітараў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўважліва ставіцца да яе самабытнасці і духоўнага зместу.

Артэфакты нацыянальнай культуры – гэта вынік шматвяковай працы, натхнення, таленту, руплівасці і настойлівасці многіх пакаленняў беларусаў. У іх увасоблены духоўныя ідэалы, спадзяванні, надзеі беларускага народа. Гэта скарбонка плённых вынікаў, якая павінна быць не толькі захавана, але і папаўняцца новымі творчымі дасягненнямі. Разам з тым многія артэфакты беларускай культуры маюць патрэбу ў рэвіталізацыі, а таксама ў сучаснай інтэрпрэтацыі і ва ўключэнні ў творчы працэс.

Над вяртаннем нацыянальнай культурнай спадчыны ў жыццё сучаснага грамадства працуюць вучоныя, спецыялісты-практыкі, педагогі, майстры нацыянальнай культуры. Гэты працэс у значнай ступені забяспечваецца прафесійнай працай арганізацый і ўстаноў галіны культуры. Важны ўнёсак у працэс рэвіталізацыі робіць калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У культурнае жыццё сучаснай Беларусі вяртаюцца творы і помнікі традыцыйнай культуры, між іх узоры народна-песеннай творчасці, харэаграфічнага фальклору і інш. Сёння народная творчасць не з'яўляецца простым паўторам мастацкіх кано-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наў і паказальных прыкладаў з мінулага. Адраджэнне дасягненняў традыцыйнай культуры развіваецца як жывы працэс, увасабляецца ў разнастайных формах, уключае выкарыстанне класічных і інавацыйных падыходаў да інтэрпрэтацыі. Пры гэтым неабходна захоўваць духоўны змест формаў і з'яў культурнай спадчыны.

Педагагічная, навукова-даследчая і творчая дзейнасць калектыву ўніверсітэта накіравана на захаванне і папулярызацыю каштоўнасных, светапоглядных набыткаў беларусаў. Разнастайныя пытанні традыцыйнай культуры разглядаюцца пры вывучэнні спецыяльна-прафесійных, сацыяльна-гуманітарных і агульнанавуковых дысцыплін. Прафесарска-выкладчыцкі склад ажыццяўляе значную працу па выданню навуковай, вучэбнай і метадычнай літаратуры, прысвечанай розным аспектам культурнай спадчыны. Важная роля ў вывучэнні традыцыйнай культуры належыць розным відам студэнцкай практыкі. Знаёмства з мясцовымі ўзорамі фальклору ў далейшым дае магчымасці выкарыстаць гэтыя веды ў творчых праектах, пры напісанні курсавых і дыпломных работ і, самае галоўнае, дае імпульс для творчасці ў будучай прафесійнай дзейнасці.

Выпускнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, якія працуюць у сферы культуры, падтрымліваюць трывалыя сувязі з арганізацыямі і ўстановамі культуры, дзейнасць якіх накіравана на захаванне і папулярызацыю традыцыйнай культурнай спадчыны. Гэта нацыянальныя і рэгіянальныя музеі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, вядучыя творчыя калектывы краіны і інш.

Адным з прыярытэтных кірункаў даследчай дзейнасці спецыяльных кафедр універсітэта з'яўляецца збор і сістэматызацыя фальклорных матэрыялаў. У гэтым напрамку актыўна працуюць кафедры этналогіі і фальклору, харэаграфіі, народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва. У выніку шматгадовых палявых даследаванняў назапашаны вялікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб’ём эмпірычных матэрыялаў, якія актыўна выкарыстоўваюцца ў вучэбным і творчым працэсе. Многія яркія праекты калектыву ўніверсітэта, як, напрыклад, «Сем таямніц Беларусі», створаны на грунце фальклорных матэрыялаў, атрыманых падчас палявых даследаванняў.

Важнай часткай вучэбна-творчай працы па папулярызацыі і прасоўванню каштоўнасцей традыцыйнай культурнай спадчыны з’яўляецца актыўная канцэртная і сцэнічная практыка. Традыцыйнай для кафедры харэаграфіі стала арганізацыя фальклорных вечарын, якія праводзяцца на аснове матэрыялаў, сабраных у экспедыцыях па розных рэгіёнах Беларусі. Дадзеная форма спалучае вучэбны, эксперыментальны, творчы аспекты, дазваляе авалодаць навыкамі даследавання, рэалізаваць крэатыўны патэнцыял у форме аўтарскай рэжысёрска-пастановачнай, рэпетыцыйнай і выканальніцкай дзейнасці. Вынікам арыгінальнага творчага праекту кафедры харэаграфіі стала тэатралізаванае прадстаўленне, якое ўключала танцы, гульні, песні і было з поспехам паказана на пляцоўцы Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

Распрацаваныя студэнтамі і педагогамі сцэнарныя і пастановачныя матэрыялы ў далейшым выкарыстоўваюцца ў дзейнасці вучэбных і культурна-асветных устаноў. Вялікае значэнне надаецца ўдзелу студэнтаў у творчых і справаздачных канцэртах, традыцыйных святах і абрадах.

Далучэнне студэнтаў да навукова-даследчай працы па збіранню, вывучэнню, творчай апрацоўцы ўзораў традыцыйнай культуры, актыўнага ўдзелу ў фальклорных праектах і фестывалях надае вучэбнаму працэсу новы ўзровень падрыхтоўкі высокапрафесійных спецыялістаў, годных наследнікаў беларускай культурнай спадчыны.

*Рэктар*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт* ***А. А. Корбут***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ